*Алена Вострыкава*

# ПАКАЛЕННЕ 1924 І ГІСТОРЫЯ ЧЭШСКАГА ПРАТЭКТАРАТУ ПРАЗ ПРЫЗМУ МІФА ПРА АРФЕЯ Ў РАМАНЕ ЧЭШСКАГА ПІСЬМЕННІКА ЯНА АТЧАНАШАКА «КУЛЬГАВЫ АРФЕЙ»

*Роман чешского писателя Яна Отченашека «Хромой Орфей» принадлежит к военной прозе второй волны. В качестве жанровых составляющих выделяются философские и психологические элементы. Главный акцент в романе делается именно на идейную проблематику, на споры экзистенциального характера, которые ведут представители разных социальных групп. Автор в романе полемизирует с нигилистическим крылом экзистенциализма, индивидуализмом, пассивной жизненной позицией. Все любовные отношения, описанные Отченашеком, можно рассматривать через призму мифа об Орфее, которому нельзя было оглянуться, чтобы не потерять и спасти свою возлюбленную. Писатель показал в романе эмоциональную атмосферу немецкого протектората в чешских землях. Отченашек ставит в своем романе вопросы отношений человека и общества, смысла человеческого существования и показывает, что философия действия всегда более правильная, чем позиция бездействия. Своей структурой роман противостоит чешским реалистическим романам 1950-х гг. Произведением автор полемически реагирует на общественно-политическую, историческую и литературную ситуацию того времени. Образ же мифического Орфея дает художественному текстудополнительные смыслы и подтексты, а также одну из возможных перспектив, через которую можно рассматривать образы, проблематику и поэтику романа.*

*The novel of the Czech writer Jan Otchenaszek "The Lame Orpheus" belongs to the military prose of the second wave. Philosophical and psychological elements are singled out as genre components. The main emphasis in the novel is on the ideological issues, on the existential disputes, which are the representatives of different social groups. The author in the novel controversies with the nihilistic wing of existentialism, individualism, passive attitude to life. All the love relationships described by the Otchenashek can be viewed through the prism of the myth of Orpheus, who could not look back so as not to lose and save his beloved. The writer showed in the novel the emotional atmosphere of the German protectorate in the Czech lands. Otchenashek poses in his novel questions of the relationship between man and society, the meaning of human existence and shows that the philosophy of action is always more correct than the position of inaction. Its structure is opposed to Czech realistic novels of the 1950s. With his work, the author reacts polemically to the socio-political, historical and literary situation of that time. The image of the mythical Orpheus gives the artistic text additional meanings and subtexts, as well as one of the possible perspectives through which the images, problems and poetics of the novel can be viewed.*

Раман чэшскага пісьменніка Яна Атчанашака (1924 – 1979) «Кульгавы Арфей» (1964) распавядае пра падзеі Другой сусветнай вайны і часы пратэктарату ў Чэхаславакіі. У цэнтры ўвагі пакаленне 1924 года, да якога, дарэчы, належыў і сам аўтар. Гэта пакаленне так званага татальнага прызыву. У пачатку вайны прадстаўнікі гэтага пакалення былі непаўналетнімі.Многія з іх толькі што скончылі гімназію. Дарэчы, так было і з самім аўтарам, які ў гады нямецка-фашысцкай акупацыі працаваў на заводзе і ўдзельнічаў у Руху Супраціўлення. Калі пачалася вайна, менавіта гэтыя хлопцы і дзяўчыныпрымусова вымушаны былі працаваць у Германіі, а таксама на заводах і фабрыках па нямецкай мабілізацыі на працу. Раман пісаўся ў той перыяд, калі ў Чэхаславакіі з’явілася так званая другая хваля ваеннай прозы. Яе пачынальнікамі былі Н. Фрыд са сваім раманам «Картатэка жывых» і сам Я. Атчанашак з аповесцю «Рамэа,

Джульета і цемра» (1958), падзеі якой цесна звязаны з раманам «Кульгавы Арфей», паколькі ў ім падаецца працяг папярэдняй гісторыі.Раман з’яўляецца ў часы, калі ў Чэхаславакіі «зноў узнікла пытанне дэідэалагізацыі мастацтва. Вядзецца барацьба з дагматычным, нятворчым мысленнем» [6, *115*]. У «Кульгавым Арфеі» творца засяроджваецца на ваенных лёсах свайго пакалення і спрабуе стварыць аб’ектыўны літаратурны вобразакупацыі. Раман вельмі складаны. У якасці жанравых чыннікаў у ім яскрава вылучаюцца філасофскія і псіхалагічныя элементы. Мы становімся сведкамі шматлікіх філасофскіх, рэлігійных і ідэалагічных дыскусій і разважанняў. У рамане галоўны акцэнт змяшчаецца Атчанашакам менавіта на ідэйную праблематыку, на спрэчкі экзістэнцыяльнага характару, якія вядуцца прадстаўнікамі розных сацыяльных груповак і класаў, а таксама на супрацьпастаўленне скепсіса і цярплівасці актыўнаму грамадзянскаму дзеянню, нават дакладней супрацьдзеянню ва ўмовах фашысцкага пратэктарату. «Прадметам дыскусій становяцца адносіны паміж буржуазнай і пралетарскай ідэалогіяй» [6, *115*]. Даследчыца-багемістка І. А. Бернштэн зазначыла: «Атчанашак…абмяжоўваецца замкненым коламpражскай моладзі, не выводзячы дзеянне свайго рамана на больш шырокія шляхі, пракладзеныя гісторыяй, – таму яго твор нельга назваць эпапеяй. Яго асноўны сэнс заключаецца ў тых канфліктах этычнага і грамадскага парадку, якія ставіць і неадкладнага рашэння якіх патарабуе жорсткая эпоха» [1, *66*]. Чалавек паказаны ў рамане ў складанай гістарычнай сітуацыі, ён вымушаны вызначыць свае адносіны да яе, вырашыць, які ўдзел будзе прымаць у падзеях. Атчанашак імкнецца выразіць логіку гісторыі, якая завязана на актыўных дзеяннях людзей. Таму твор паказвае магчымасці чалавека, меру свабоды кожнага. У свой час негатыўнае стаўленне да

«Кульгавага Арфея» літаратурнай крытыкі адлюстроўвала спецыфічныя адносіны да пасляваеннай рэчаіснасці, якія сталі магчымымі ў часы дэмакратызацыі ў 1960-я гг. у Чэхаславакіі.

Раман утвараюць трыццаць пяць глаў, якія аўтар размяркоўвае па трох частках. Дзеянне адбываецца ў 1944 –1945 гг. у Празе і на тэрыторыі ваеннага завода, дзе вырабляюць і рамантуюць самалеты. Менавіта тут працуе група так званых «татальнікаў», народжаных у 1924 г. Да іх належыць галоўны герой і апавядальнік многіх тэкставых пасажаў Гонза, у вобраз якога чэшскі пісьменнік уклаў многія аўтабіяграфічныя рысы. Ён паходзіць з няпоўнай сям'і (гэта часты матыў у многіх творах Атчанашака). Вельмі многа чытае розных кніг: Ванчуру, Шульца і іншых. Сам спрабуе пісаць мастацкую прозу. Падчас адной рабочай змены гестапа на вачах усіх рабочых забівае Пішката, пасля якога застаецца патаемны скрутак. У ім знаходзіцца рэвальвер. Група маладых хлопцаў пад уплывам гэтых падзей вырашае стварыцьнелегальную групу супраціўлення фашыстам пад назвай «Арфей». Членамі названай групоўкі становяцца Мілан, дагматычны прыхільнік камунізму; Войта, рабочы, сын прыбіральшчыцы; Каміл па мянушцы Бацыла, сын адваката, баязлівы таўсцячок, самы вялікі клопат якога – пазбавіцца цнатлівасці; Павел, вядомы чытачу па аповесці «Рамэа, Джульета і цемра», які пражывае ў рамане новыя адносіны з Монікай, але стала смуткае па яўрэйскай дзяўчыне Эстэр, якая была забіта немцамі (але пра што дакладна хлопец не ведае і таму мае марную надзею); і ўрэшце ліберальна настроены Гонза, які не любіць дэманстратыўных, паказных і артадаксальных аўтарытэтаў і таму пастаянна канфліктуе з Міланам. Гонза, ён жа Ян, мае стасункі і з колам «залатой моладзі», дзе сустракаецца з яшчэ адным важным персанажам рамана, Душанам,які знаёміць яго з філасофіяй

экзістэнцыялізма і многімі інтэлектуальнымі кнігамі і плынямі. Размовам Гонзы і Душана Атчанашак адводзіць шмат старонак свайго твора. Падрабязна апісваецца самагубства Душана і шлях хлопца да яго. Душан успрымае самагубства як абсалютнае праяўленне чалавечай свабоды, а смерць – як адну з экзістэнцыяльных бясспрэчнасцяў. Свайго бацьку Душан называе «Палоніям», як героя Шэкспіра. Хлопец не прымае яго прыстасаванства пры пратэктараце, яго прыгатаваныя алібі, яго разважанні пра пакуты чэшскага народа. Але сэнсу у змаганні Душан таксама не бачыць. Будучае для яго поўнае крыві і агіды. «Политика? Не верю в нее, потому что не верю в историю… Когда-то я этим занимался, но потом бросил. Не верю, что есть какой-то смысл в истории, и не верю, чтоб существовало нечто вроде прогресса… Инквизиция была, пожалуй, идиллией в сравнении снынешними концлагерями»**,** – прамаўляе Душан [4*, 154–155*].Свой індывідуалізм ён даводзіць да абсурда, што бачна нават ў яго гісторыі кахання. Каб захаваць сваю ўнутраную свабоду, Душан выбірае самазабойства, вечнае небыццё.Раман, на нашу думку, не з'яўляецца рэканструкцыяй усяго кангламерата існуючых поглядаў таго перыяду. Аўтар, як нам падаецца, перш за ўсё палемізуе з нігілістычным крылом экзістэнцыялізма, з індывідуалізмам і пасіўнай жыццёвай пазіцыяй.

Самым актыўным і няўрымслівым сярод такіх розных па сваім сацыяльным становішчы, па адукацыі, па характары і жыццёвай пазіцыі, па вопыце аказваецца Павел. Яго імкненне да актыўнага супрацьдзеяння акупантам, выкліканае няўдалым, разбураным каханнем з яўрэйкай, вымушае яго да спробы падарваць цягнік з нямецкай тэхнікай і вядзе да смерці. Астатнія ўдзельнікі «Арфея» друкуюць і распаўсюджваюць улёткі, ламаюць дэталі, многа спрачаюцца, хаваюць рэвальвер. Гонза

некалькі разоў пападае ў рукі немцаў. Першы раз яго вызваляюць дзякуючы заступніцтву ягодзяўчыны Бланкі, якая жыве з нямецкім афіцэрам гестапа. Другі раз Гонзу выратоўвае яго напарнік па рабочым месцы Меліхар, які ўваходзіць у іншую нелегальную групу супраціўлення.

Усе апісаныя пяць маладых хлопцаў вельмі розныя. Яны не могуць стаяць адзін за аднаго. Нават «Арфей» не можа звязаць іх ў адно цэлае. Нездарма Арфей з падачы творцы рамана становіцца кульгавым, што сведчыць пра разнароднасць створанай групы, адсутнасць аднолькавых інтарэсаў і матываў. Тым не менш, мы разумеем, што само існаванне гэтай арганізацыі і ўдзел у ёй пакінуў ў хлопцах вельмі значны след. Маладыя людзі мараць пра свабоду, яны не хочуць проста чакаць, што вызваленне ім нехта прынясе звонку. Хаця ўсе яны па-рознаму бачаць жыццё і барацьбу. Шлях Гонзы паказаны аўтарам вельмі пакутлівым, бо хлопец рэфлексуе, вагаецца, займаецца самааналізам, спрабуе знайсці цвёрдыя жыццёвыя каштоўнасці. Ён разважае: «У человека только одна жизнь. И довольно короткая. История катится вперед, меняются режимы, а что во всем этом человек? Навоз. Скули от страха, человек, здесь творится история, прогресс, а на самом деле это бешеная скачка куда-то вперед – через его труп. А ведь в нем, в каждом отдельном человеке, целый мир. Вселенная» [4, *261*]. Мілан апісваецца як сапраўдны левы радыкал, які засвоіў некалькі марксісцкіх лозунгаў і ўпэўнены, што ён вядзе «Арфей» на барацьбу. Бацыла ўсяго пужаецца, аднак хоча даказаць, што ён у стане адмовіцца ад прывілей свайго класу. Самымі шчырымі барацьбітамі становяцца Войта і Павел. Яны рашучыя і сапраўды мужныя, здольныя да актыўных дзеянняў. Усе пяцёра не ўпэўненыя, ці дадуць іх крокі які-небудзь эфект, ці не будуць ахвяры занадта вялікімі ў

параўнані з іх справамі. Асабліва Павел многа думае пра феномен калабарацыянізма. Ён хвалюеецца, каб самому не аказацца ў шэрагах калабарацыяністаў з-за свайго бяздзеяння. Ён намагаецца наладзіць сувязь з больш буйной і арганізаванай арганізацыяй Супраціўлення. Нават наіўная і дылетанцкая дзейнасць «Арфея» дазваляе хлопцам адчуць сябе іншымі людзьмі ў атмасферы жаху, баязлівасці і бяздзеяння, якая пануе вакол іх. Яны не так пакутуюць ад прыніжэння іхчалавечай годнасці, паколькі не пагадзіліся з сітуацыяй і зрабілі свой выбар. «Самае моцнае ў рамане Атчанашака тое, што ён паказаў барацьбу, супраціўленне не толькі як абавязак, але і як маральную неабходнасць ў чалавеку, як ўмову яго маральнага здароўя» [1, *69*].

У рамане відавочна супрацьпастаўленне пакалення інтэлігенцыі, якая была выхавана на абстрактна-гуманістычных поглядах Т. Г. Масарыка, прынцыпах асабістай прыстойнасці, і пакалення рабочых. Маладыя гімназісты разбіраюцца ў розных плынях філасофіі, але да рэальнай барацьбы, рэальнага жыцця і супрацьстаяння нацыстам яны непадрыхтаваныя, а некаторыя і няздольныя. «Залатая моладзь» чакае вызвалення ад заходніх саюзнікаў і баіцца Чырвонай Арміі. Беспрынцыпны Алеш гатовы прыстасавацца нават да нялюбага яму сацыялістычнага ладу грамадства. Ён проста жадае заўсёды быць пераможцам і займаць ключавыя пазіцыі. Чалавекам справы Атчанашак паказвае Меліхара, пажылога рабочага, майстра і ўмельца, чалавека вялікай фізічнай сілы, зусім негаваркога і непатэтычнага. Ён заўсёды выступае супраць неасцярожных размоў «гімназісцікаў». Менавіта ён і ратуе Гонзу ад смерці.

Значнае месца ў рамане «Кульгавы Арфей» адводзіцца любоўным гісторыям галоўных герояў. Руская багемістка І. Бернштэйн зазаначае:

«Атчанашак імкнецца паказаць “выхаванне пачуццяў” сваіх герояў ва ўсёй паўнаце, і кожны з іх побач з перыпетыямі, звязанымі з «Арфеем», перажывае любоўную драму» [2, *264*]. Цікава тое, што ўсе яны ўтвараюць трохкутнікі: Гонза-Бланка-нямецкі афіцэр Георг, Войта-Алена-Алеш і Павел-Моніка-Эстэр. Гонзава каханне знішчае веданне таго, што яго дзяўчына мае інтымныя адносіны з нацысцкім афіцэрам. Гісторыя Бланкі і Георга – гэта своеасаблівы варыянт біблейскага міфа пра Юдзіф і Алаферна, паколькі Бланка пагаджаецца на сувязь з Георгам дзеля таго, каб уратаваць ад смерці свайго роднага брата Здэнка, схопленага фашыстамі. Калі яна даведваецца, што брата забілі яшчэ год таму назад у турэмным засценку, то яна забівае Георга ў яго на кватэры. Войта, просты і шчыры рабочы, які захапляецца ўсялякімі механізмамі і мае «залатыя рукі»да тэхнікі, з маленства кахае дачку гаспадыні вілы і архітэктара Алену, якая «пражыгае» жыццё ў кампаніі «залатой моладзі», слухаючы джаз, распіваючы дарагое спіртное, маючы інтымныя стасункі з «роўным сабе» Алешам. Каб выратаваць Алену ад працы ў Германіі альбо на заводзе, багатая маці прапануе Войце ажаніцца з яе дачкою. Той пагаджаецца, не разумеючы, што шлюб фіктыўны. Алеш жа не жадае шлюбам з Аленай звязваць падчас вайны сабе рукі, нават даведаўшыся пра яе цяжарнасць. Войта гатовы гадаваць чужое дзіця, але маці схіляе Алену на аборт. Пасля гэтага хлопец сыходзіць з дому, а пазней з летчыкам-аматарам Коцкам рашаецца на тое, каб у часы налету саюзніцкай авіяцыі ўгнаць самалет з заводскага аэрадрома і выляцець у Славакію. Адносіны ж Паўла і цяжка хворай Монікі знаходзяцца ў цені мёртвай Эстэр. Моніка гэтага не можа вынесці і разыходзіцца з Паўлам яшчэ перад яго трагічнай смерцю. Усе любоўныя адносіны, апісаныя Атчанашакам, можна разглядаць праз прызму міфа пра Арфея, якому

нельга было азірнуцца, каб не страціць і выратаваць сваю каханую. Усе маладыя людзі, прадстаўнікі пакалення 1924 года, пастаянна азіраюцца на сваё мінулае і ніяк не могуць яго пераадолець. Бланка адмаўляе Гонзе, таму што думае толькі пра свайго брата. Сучаснае становіцца для яе фікцыяй. Усё яе жыццё падпарадкавана ідэі захавання яго жыцця праз яе ганьбу, пра якую ведаюць суседзі, рабочыя завода і «татальнікі». Пасля трагічнай развязкі яе жыццё страчвае сэнс. Войта спрабуе пераадолець пропасць паміж сабой і Аленай. Ён, бедны, неадукаваны, але таленавіты ў тэхнічным плане, не ўпісваецца ў кола сяброў Алены, якая хоча стаць спявачкай, якая заўсёды мела прыслугу і шмат грошай, марыць пра Амерыку. Аднак Атчанашак не пакідае сваім героям шанец быць шчаслівымі. Прамой праекцыяй вобраза Арфея можа быць Павел, які сапраўды чакае, што яго каханая Эстэр паўстане са свету мёртвых, з’явіцца з небыцця канцлагера альбо яшчэ аднекуль. Моніка намагаецца разбурыць марныя спадзяванні хлопца, але выклікае гэтым толькі яго непрыязнасць.

Раман чэшскага пісьменніка адынамічны. Сюжэт не адыгрывае ў ім вялікай ролі. Галоўнае, што Атчанашак змог стварыць і вельмі скрупулёзна перадаць маральную, эмацыянальную атмасферу нямецкага пратэктарата ў чэшскіх землях. «У чэшскім рамане на першы план выступае майстэрства “глыбіннай разведкі” ўнутранага свету чалавека» [3, *137*]. Аўтар падрабязна падае дыялогі, шматлікія ўнутраныя маналогі герояў, іх разважанні. Дарэчы, думкі і погляды кожнага вельмі індывідуальныя, яны адпавядаюць характару, сацыяльнаму становішчу, адукацыі і светапоглядам герояў. Трэба зазначыць, што ў рамане даволі шмат спрэчак і разважанняў, ніяк не звязаных з асноўным дзеяннем. Напрыклад, гэта размовы пра тую ці іншую плынь філасофіі, кнігі,

джазавую музыкуі танцы. Атчанашак ужывае шмат грубых выразаў, сленг «татальнікаў», мову «залатой моладзі» адначасова са складанымі разважаннямі наконт тых ці іншых філасофскіх праблем. Мова твора, безумоўна, вельмі экспрэсіўная. Таксама можна сцвярджаць, што ў рамане адбываецца атаясамліванне аўтара і пратаганіста ў вобразе Гонзы, асабліва гэта заўважна ў самым канцы твора. Раман «Кульгавы Арфей» становіцца раманам цэлага пакалення чэшскай моладзі, лёсы якіх адлюстроўваюццца праз ужо класічныя гісторыі. Чэшскі даследчык Віцеслаў Рзоўнэк упэўнены, што «Атчанашак з’яўляецца эпікам з вялікім акцэнтам на псіхалагічных баках чалавечага характару, ён мае мэту паказаць лірычныя складнікі чалавечай душы» [7, *41*].

Выкарыстанне для назвы шараговай нелегальнай групоўкі імя міфічнага песняра з эпітэтам «кульгавы» паказвае негрунтоўнасць гэтага ўтварэння. У рамане Атчанашак гаворыць, што хлопцы абралі такую назву для сваёй арганізацыі супраціўлення выпадкова, але сам аўтар, як нам падаецца, укладваў у гэта пэўны падтэкст, паколькі Арфей – вельмі загадкавая постаць у міфалогіі. Арфей з’яўляецца ў вельмі складаны для гісторыі Грэцыі час, калі людзі прыходзяць да паўдзікага стану, калі шырыцца культ фізічнай сілы і сілы Вакха, а на паверхню выходзяць самыя грубыя і нізкія праявы чалавечай натуры. Усё гэта можна суаднесці з гістарычнай, грамадска-палітычнай сітуацыяй у Чэхаславакіі і Еўропе ў цэлым. «Залатая моладзь» Прагі сапраўды аддаецца грубым плоцкім захапленням, шмат п’е да скоцкага стану і так бавіць час. Вобраз Арфея супрацьстаіць такому ладу жыцця, падобным настроям і пачуццям, паколькі ён «той, які лечыць святлом», ён валодае лірай, ён ратуе сваіх сяброў у падарожжы зазалатым руном. Арфей змагаецца супраць культа Вакха і гіне ад рук вакханак. Групоўка хлопцаў таксама перастае існаваць,

а іх лёсы развіваюцца даволі трагічна. Аднак Арфей, згодна міфам, нясе людзям святло, імпульсы да новай рэлігіі і культуры. Ён супрацьстаіць грубай сіле сваім аскетызмам, чысцінёй, высокай этыкай і мараллю. Тыя ж самыя памкненні мы назіраем і ў членаў групоўкі «Арфей». Яны праходзяць праз выпрабаванні сябе і такім чынам становяцца больш годнымі, лепей разумеюць сваю натуру. Павел разважае: «Сейчас они разойдутся, и его поиски начнутся сначала. Потому что «Орфей» уже мертв. Правда ли это? Да и чем, собственно, был «Орфей»? Пятеро юношей с голыми руками, не опытных и не искушенных в борьбе, пятеро не похожих друг на друга и не очень-то ладивших героев с деревянными сабельками, которых те не потрудились даже тщательно выловить, не стоят того. Шляпы. Да, может быть. И все-таки хорошо, что был «Орфей»! Хорошо! Потому что он был важен для них еще чем-то другим, что трудно определить. Вот, например, месть за Пишкота и мучительная тяга к чему-то, без чего каждому из них было бы страшно жить на свете. Да, это им давал «Орфей». Решимость не смириться, не быть тотально мобилизованным бараном. И это давал «Орфей». Сопротивление, смелый вздох в атмосфере, зараженной всеобщей робостью. И это тоже. У них будет право глядеть потом людям в глаза. Да и это! А кроме того, у каждого были свои чисто личные мотивы. У меня, у Милана, у Бацилы. Надо будет сохранить в себе все это. И в будущем. Навсегда» [4, *454*]. Вучэнне Арфея несла людзям святло, чысціню і любоў. У рамане члены нелегальнай групы таксама намагаюцца абудзіць чалавецтва, паказаць, што трэба нешта рабіць, а не бяздзейнічаць. «Арфей» дае яго ўдзельнікам адчуванне сапраўднага жыцця, натхненне і свет кахання. Менавіта Арфей вельмі шчыра і аддана кахае Эўрыдыку і адпраўляецца за ёю ў царства Аіда. Загад бога Аіда Арфею «Не азірайся!» можна прасачыць на

прыватных лёсах усіх дзеючых персанажаў твора. Эўрыдыка сыходзіць на неба і адтуль натхняе Арфея, менавіта там міфічны герой сустракаецца са сваёй каханай. Чым бліжэй Арфей да неба, да ўсяго ўзнёслага, тым бліжэй ён і да Эўрыдыкі. Дакладна так адбываецца і з Паўлам, які пасля страты Эстэр змяняе сваё жыццё, свой светапогляд. Каханне да яўрэйскай дзяўчыны падштурхоўвае хлопца да актыўных дзеянняў, да разважанняў пра канцлагеры, пра тое, што адбываецца за межамі жыцця пражскіх абывацеляў. У Паўла, Войты і Гонзы ў рамане каханне нешчаслівае, пакутлівае, звязанае з перашкодамі і выпрабаваннямі, як у Арфея. Але маладыя людзі годна выходзяць з вельмі складаных жыццёвых сітуацый, становяцца больш моцнымі і высакароднымі.

Такім чынам, мы можам сцвярджаць, што чэшскі пісьменнік ставіць у сваім рамане пытанні адносін чалавека і грамадства, сэнсу чалавечага існавання і паказвае, што філасофія дзеяння заўсёды больш правільная, чым пазіцыя бяздзеяння. Аўтар паказвае, што лепш быць не назіральнікам жыцця, а яго творцай. Меркай многіх чалавечых якасцей чалавека ў Атчанашака становяцца адносіны паміж мужчынам і жанчынай, у выніку якіх нараджаецца жыццё. У творы суіснуюць і пераплятаюцца дзве наратыўныя лініі. Першая з іх звязаная з Гонзай, гісторыяй яго лёсу. Расказваецца яна ад першай асобы. Другая частка – гэта жыццё астатніх герояў, як яго падае апавядальнік. Абедзве лініі звязваюцца вобразам Гонзы, які мае рысы самога аўтара. Менавіта Гонза пачынае і заканчвае раманнае дзеянне і яднае ў адно цэлае ўсё лініі рамана, паколькі астатнія вобразы і персанажы прама ці апасродкавана знітаваны з ім. Сваёй структурай раман аспрэчвае чэшскія рэалістычныя раманы 1950-х гг. з усёведаючым апавядальнікам. Атчанашак сваім творампалемічна рэагуе на тагачасную грамадска-палітычную, гістарычную і літаратурную

сітуацыю. Вобраз жа міфічнага героя Арфея надае мастацкаму тэксту дадатковыя сэнсы і падтэксты, а таксама адну з магчымых перспектыў, праз якую можна паглядзець на вобразы, праблематыку і паэтыку рамана.

## ЛІТАРАТУРА


1. *Бернштейн, И. А.* Эпос обновления жизни / И. А. Бернштейн. – М. : Советский писатель, 1982.– 344 с.
2. *Бернштейн, И. А.* Роман о судьбе поколения / И. А. Бернштейн // Новый мир. 1967. №1.– С.262 – 265.
3. *Бернштейн, И.* Современный чешский и словацкий роман/ И. Бернштейн, Э. Олонова. – М. : Изд-ва АН СССР, 1962. – 172 с.
4. *Отченашек, Я.* Хромой Орфей / Я. Отченашек. – Кишинев : Литература артистикэ, 1986. –535 с.
5. *Otčenášek, J.* Kulhavy Orfeus /J. Otčenášek. –Praha : ČS, 1964. –563 s.
6. *Rzounek, V.* Otčenášek / V. Rzounek. –Praha : ČS, 1985. – 248 s.
7. *Rzounek, V.*Realismus a soudobá proza / V. Rzounek. –Praha : Univerzita Karlová, 1973. – 60 s.